может создать только талантливый дизайнер.

Вот такой у нас маркетинг! Но откуда?

Отсюда! В перерыве между лекциями, в поточной аудитории университета задаю вопрос сорока трём студентам-маркетологам (5-курс): «Что продаёт каждое конкретное предприятие?».

Только одна студентка ответила: «Свою торговую марку!». Поправлю: «Свою торговую марку, на своём товаре, который только ею и отличается от товаров конкурентов».

Как выразился в своей статье «О маркетинге», состоящей из одного предложения, Артемий Лебедев: «Маркетинга не существует!».

А вот выдержка из другой его статьи «Большая маркетологическая глупость».

«Стремление идти проверенным путём рождает уродцев без души и смысла. Без эксперимента и смелости нельзя добиться нового и интересного. Крупные компании набирают штаты маркетологов, большая часть которых с рождения боится думать.

Современный маркетинг – машина по убийству идей. Большая советская энциклопедия определяет маркетинг как «одну из систем управления капиталистическим предприятием, предполагающую тщательный учёт процессов, происходящих на рынке, для принятия хозяйственных решений». На практике же достаточно посмотреть на круг служебных обязанностей маркетолога, чтобы убедиться в том, что в «принятие хозяйственных решений» попадает и ответственность за «креатив». А это уже совсем плохо формализуемая область деятельности – творческая мысль не подлежит обязательной сертификации. И сегодня достаточно назваться маркетологом, чтобы говорить дизайнеру: «Чёрный цвет – мрачный». Или: « От красного цвета повышается кровяное давление». Или ещё какую-нибудь чушь, состоящую из безграмотных журналистских «открытий» и бытовых предрассудков. Маркетолог (как всякая поставленная на конвейер специальность) живёт по принципу инфузории и выполняет одноклеточную функцию. Как правило, эта функция заключается в том, чтобы применять минимальный набор знаний и правил для выживания».

И там же: «Большая часть маркетологов вообще не помнит, что «маркетинг» происходит от слова «market», то есть рынок. Это и не нужно – достаточно иметь под рукой пару умных фраз для прикрытия своих действий. Любой учебник по маркетингу (или по рекламе) долго расписывает научный подход, но на последней странице мелко будет написано, что на самом деле не вредно иметь мозги и быть удачливым. Это и есть та самая лазейка, которая позволяет забить на все правила и формулы».

«Никто не знает, как заработать миллион или произвести популярный кетчуп. Но каждый, у кого получилось, знает, что это произошло не по-научному, а в результате везения и применения мозгов», – завершает свою статью Артемий Лебедев.

УДК 745/749

# МІФАЛАГЕМА “ДРЭВА ЖЫЦЦЯ” Ў ТВОРЧАСЦІ НАТАЛЛІ ЛІСОЎСКАЙ, СВЯТЛАНЫ БАРАНКОЎСКАЙ І ТАЦЦЯНЫ КОЗІК

***Свістунова А. Г., ст. навуковы супрацоўнік***

*Музей гісторыі Віцебскага народнага мастацкага вучылішча, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*

Рэферат. *У артыкуле разгледжана міфалагема “Дрэва жыцця” ў творчасці беларускіх мастачак.*

Ключавые словы: міфалагічныя сюжэты, элементы дынамікі, габелен.

Міфалагема “Дрэва жыцця” выкарыстоўвалася ў рэлігіі, філасофіі і міфалогіі многіх культур і народаў, а таксама ў якасці сіноніма свяшчэннага дрэва.

“Дрэва жыцця”, што злучае ўсе формы жыцця, і “Дрэва ведаў”, якое аб’ядноўвае нябёсы і падземны свет, з'яўляюцца формамі “Сусветнага дрэва”, або касмічнага дрэва, і адлюстроўваюцца ў розных рэлігіях і філасофіі як адно і тое ж дрэва.

У славянскай народнай традыцыі міфалагема “Дрэва жыцця” таксама з’яўляецца варыянтам “Сусветнага дрэва”. Гэта міфалагічная мадэль космасу, сусвету, якая падзеленая на тры вертыкальныя зоны: верхняя – крона дрэва – птушка, сярэдняя – ствол – зямля – капытныя (алені) і ніжняя – карэнні – апраметная – змяя. Міфалагічныя істоты – птушка, алені, змяя – гэта зааморфныя сімвалы трох вертыкаляў космасу.

Міфалагема “Дрэва жыцця” шматгранна выявілася ў фальклоры і сусветнай літаратуры і ўжытковым мастацтве. Асабліва прыцягальнай гэта ідэя з’яўляецца для мастакоў, якія пераасэнсоўваюць міфалагічныя сюжэты, вобразы, матывы.

У творчасці трох беларускіх мастачак Наталлі Лісоўскай, Святланы Баранкоўскай і Таццяны Козік яскрава выявіліся матывы, сюжэты “Дрэва жыцця”. Іх габелены надзвычай энергетычныя, напоўненыя архаічнымі знакамі, сімваламі, вобразамі беларускай міфалогіі.

Лесвіца ў неба або Сусветная Гара з’яўляецца мастацкай стылізацыяй вобразу Сусветнага дрэва, умоўным мостам паміж небам і зямлёю і адной з варыяцый міфалагемы “Дрэва жыцця”. Гэтую ідэю сцвярджае тэкстыльная кампазіцыя Наталлі Лісоўскай «Лесвіца ў неба. Памяці Наталлі Філіпаўны» (2013), прысвечаная хроснай маці мастачкі.

Вертыкальны фармат тэкстыльнай кампазіцыі «Беларускі калейдаскоп» (2013) апеліруе да формы беларускага рушніка. У аснову вобразнай структуры твора пакладзены прынцып калейдаскопа. Фактура паверхні тканых частак шчыльная і роўная. Колер становіцца гранічна лакальным, прычым, дамінуюць выразныя дэкаратыўныя плямы чырвонага колеру.

Статычная, чатырохчастная структура з элементамі дынамікі (нераўнамернае запаўненне колерам, асіметрыя ў крузе) падпарадкавана геаметрыі вертыкальных і гарызантальных ліній. Кожная з чатырох частак работы нясе асобную сэнсавую і арнаментальную нагрузку, у аснову якой пакладзены беларускі арнамент, які шырока выкарыстоўваўся ў народным ткацтве. У інтэр'еры сцяна выконвае ролю прасторавай цэзуры ў пустэчах паміж тканымі часткамі габелена.

Стрыманы, прыглушаны каларыт вылучае габелен «Забытая вёска» (1989), дзе велізарнае, старое, дуплістае дрэва набывае значэнне цэнтральнага кампазіцыйнага элементу.

На другім плане – дамы з цёмнымі, патухлымі вокнамі. Не выпадкова на першым плане вялікае, моцнае дрэва. Яно дамінуе над наваколлем, дрэва з’яўляецца ахоўнікам, уладаром гэтай мясціны, яго сакральным цэнтрам. Відавочна, што для творцы штуршком для стварэння вобраза дрэва-уладара стала замацаванае ў народнай свядомасці Вялікае дрэва як сімвал велічы і магутнасці. Спакон вякоў у многіх народаў існаваў культ пакланення дрэву, якое атаясамлівалася з дравеснымі німфамі-духамі. У часы паганства дрэвы былі натуральнымі свяцілішчамі.

У габелене «Зямля квітнее» (1996) прастора дыхае, вібруе, рухаецца. Для гэтай працы характэрная багатая, разнастайная фактура паверхні, перспектыўная глыбіня, маляўнічасць. Памер габелена – каля метра, кампазіцыя набліжана да квадрата. Цэнтральным элементам з’яўляецца крона квітнеючага дрэва. Аўтар стварыў надзіва ёмісты вобраз. Гэта адначасова і лад зямнога шара – Зямлі, і бутон кветкі, і крона дрэва.

Кампазіцыйная схема габелена «Поры года» (2013) выканана як адзін з самых архаічных салярных знакаў. Гэта – сімвал сонца, яго гадавы рух, гадавы цыкл і пастаць эпох – арнаментальны знак – славянскі Калаўрат. Нярэдка яго можна сустрэць у арнаменце беларускіх рушнікоў у якасці абярэга, у народным строі Віцебскай вобласці. У гэтай працы гарманічна сумяшчаюцца два розных стылістычных прыёму: гладкае класічнае палатнянае ткацтва і ворсавы рэльеф, выкананы ў аўтарскай тэхніцы. Кантраст высокага рэльефу з гладкай паверхняй надае габелену асаблівую дэкаратыўнасць. У цэнтры кампазіцыі на белым фоне – стылізаваная птушка, па баках кампазіцыі – стылізаваны сімвал збожжа. Колер фону становіцца лакальным і гранічна асацыятыўным: чырвоны – сімвалізуе чырвонае лета, сіні – зіму і г. д. Так выбудоўваецца аўтарам асацыятыўны каларыстычны рух часоў года.

Наталля Лісоўская ў тэкстыльнай кампазіцыі «Нябесны вецер» (2012) спрабуе перадаць касмалагічны сімвал неба. У гэтай працы ўзнікае пэўная аналогія з жывапісам, у якім спалучаюцца некалькі фактурных матэрыялаў. Двухслаёвая аснова стварае кантраст паміж празрыстасцю і шчыльнасцю, што дае эфект прасторы і пэўнай перспектыўнай глыбіні. Важным момантам з’яўляецца перадача стану руху воблакаў і адчуванне парываў ветру. Дынамічная па манеры выканання, тэкстыльная структура мае празрыстую рухомую канструкцыю. Яна свабодна звісае са столі. Тэкстыльная кампазіцыя выканана ў тэхніцы валяння на сетцы з выкарыстаннем фрагментаў шкла, які імітуе дождж, вертыкальных шнуроў з сінтэтычнымі ніткамі, а яе няроўны край фармату ўзмацняе дынаміку руху .

Асобна трэба адзначыць творчасць мастачкі Святланы Баранкоўскай. Яна па свойму трактуе касмалагічныя сімвалы – неба, сонца, зямлі,ператвораныя ў сістэму сімвалаў.

У серыі габеленаў “Дванаццаць памераў шчасця” (2006) яны набываюць пэўную трактоўку. Гэта аповяд пра дванаццаць месяцаў года, з’явы прыроды, стыхіі (зямля, вада, дрэвы, сонца і г. д.) і побыт чалавека, які зашыфраваны ў знаках і сімвалах. Для габеленаў

гэтай серыі характэрна мінімальнае колеравае вырашэнне і гранічная контурнасць, лінеарнасць. Ідэя Сусветнага дрэва, Дрэва жыцця – сімвала быцця і пазнання – раскрываецца ў гэтых работах праз сістэму знакаў і сімвалаў, яго вобраз сцвярджаецца ў касмаганічным значэнні.

Асобнай гаворкі заслугоўваюць анімалістычныя, зааморфныя вобразы, якія амаль заўсёды прысутнічаюць у габеленах Таццяны Козік. Гэта вобразы птушкі, якія займаюць значнае месца ў яе работах.

Выявы птушак у такіх працах, як "Гняздо для птушкі радасці" (2000), "Адчуць на сваіх крылах залатую цеплыню" (1998), "Святочныя спевы продкаў" (2015) пазначаныя контурна, графічна і выконваюць ролю сімвала, знака, міфалагічнай істоты. Птушка займае важнае месца ў міфалогіі, рэлігіі, рытуалах і абрадах народнай мастацкай творчасці многіх народаў сусвету. Яна сімвалізуе сувязь з небам, у беларускай міфалогіі з'яўляецца ўвасабленнем сонца, пераносіць душы памёрлых.

Габелены Таццяны Козік маюць лірычнае адценне, асаблівую эмацыянальнасць, вылучаюцца паэтычнай вобразнасцю.

Мастачка шмат эксперыментуе з матэрыялам. У тэкстыльных кампазіцыях "Скарбы возера Нешчарда" (2014) з'яўляецца дрэва, якое гарманічна спалучаецца з тканай паверхняй. У гэтых працах паўстаюць касмаганічныя сімвалы вады, зямлі і камянёў.

Зямля, адна з улонняў жыцця, нараджальная і паглынальная сіла – напоўнена камянямі, якія нібы "вырастаюць" з яе і арганічна выглядаюць у навакольным асяроддзі. На Беларусі існаваў культ каменю. Папулярнымі сакральнымі аб'ектамі ў традыцыйных абрадах беларусаў з'яўляліся камяні-абярэгі.

Вялікі свет міфалагічных вобразаў, цесна звязаных з беларускімі народнымі казкамі, славянскімі міфамі і паданнямі, творча пераасэнсаваныя ў габеленах Наталлі Лісоўскай, Святланы Баранкоўскай і Таццяны Козік. Работы мастачак запрашаюць у падарожжа, якое аб'ядноўвае наша мінулае, сучаснае і будучыню.

Спіс скарыстаных крыніц


1. Дерево жизни (мифология) // Wikipedia [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://bitly.su/iBwsNgmY. – Дата доступа: 25.04.2019.
2. Беларуская міфалогія. Энцыклапедычны слоўнік. / С. Санько, [і інш.]. – Мн.: Беларусь, 2004. –592 с.
3. Кацар, М. С. Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка / М. С. Кацар; пер. з рус. мовы, літ. апрац. і навук. рэд. Я. М. Сахуты. – 3-е выд. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2013. – 224 с. :іл.
4. Конан, У. Сусветнае дрэва /У. Конан // Крыніца. – 1995. – № 5 – С. 41.
5. Конан, У. Славянская міфалогія ў кантэксце беларускай культуры. Міфалагемы / У. Конан // Мастацтва. – 1997. – № 11. – С.61.
6. Конан, У. Славянская міфалогія ў кантэксце беларускай культуры. Міфалагемы. / У. Конан // Мастацтва. – 1997 – №11 – С.62.
7. Лисовская, Н. С. Использование орнаментальных мотивов народного ткачества в современном художественном текстиле / Н. С. Лисовская; Н. С. Лисовская // Народны тэкстыль і адзенне Віцебшчыны: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі, Лепель, снежань, 2013 г. / ДУ "Віцебскі абласны цэнтр народнай творчасці". – Мінск, 2014. – С.112–115.
8. Маркавец-Гаранская, Т. Г. Колеры зямлі і неба. Лён, Полацк і паэзія ў творчасці Таццяны Козік. / Т. Маркавец-Гаранская // Мастацтва. – 2017. – № 2. – С. 12–15.
9. Сахута, Я. М. Народнае мастацтва Беларусі. – Мн.: БелЭн,1997. – 287с. :іл.
10. Токарев, С. А, Филимонова, Т. Д. Обряды и обычаи, связанные с растительностью / Сб. науч. ст.: Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы. Исторические корни и развитие обычаев. – М.: Наука, – 1983.